

Фота Аляксандра Матафонава

## Сяргей Харэўскі

мастацтвазнаўца, культуролаг, гісторык архітэктуры. Скончыў Санкт-Пецярбургскі акадэмічны інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна. Цяпер – выкладчык ЕГУ. Навуковыя зацікаўленасці: Беларусь у кантэксце гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, гісторыя мастацтва і архітэктуры Беларусі, станаўленне гарадской цывілізацыі ў Беларусі.

# Еўрапейская спадчына Беларусі
## Спроба вызначэння месцаў і аб’ектаў

Сяргей Харэўскі, Сцяпан Стурэйка

# European Heritage of Belarus
## An Attempt to Identify Sites and Monuments

An initiative European Heritage Label is run by the European Commission and currently includes 48 sites across Europe as its milestones, symbolising European ideals, values, history and integration. Unfortunately, Belarus is absent from this list. The article is an attempt to create the very first and very subjective list of Belarusian sites worth including into the European program. Among them are the archeological heritage sites of Minsk surroundings, a XII ct. orthodox church in Polack, Kreva village, legendary Niasviž, Belarusian synagogues and some other sites.

Больш чым 15 гадоў у Еўрапейскім Гуманітарным Універсітэце існуюць праграмы, звязаныя з вывучэннем спадчыны. Вырасла цэлая гэнерацыя нашых выпускнікоў, якія і цяпер прафесійна працуюць у гэтай галіне або як навукоўцы, або як практыкі; у няўрадавых арганізацыях ці турыстычнай сферы. Раней гэтыя праграмы былі скіраваны на вывучэнне найперш Беларусі і Літвы. Цяпер, у выніку трансфармацыяў, маем бакалаўрскую праграму «Еўрапейская спадчына». З аднаго боку, дысцыплінарныя і тэматычныя абсягі праграмы моцна пашырыліся, з іншага ж, яны сталі больш прадметныя, скіраваныя на фармаванне менавіта практычных кампетэнцыяў у сферы як захавання, так і выкарыстання культурнай спадчыны.

Чым ёсць у дадзеным кантэксце еўрапейскасць? Перадусім, яна палягае на акцэнтаванні ўніверсалізма ідэяў і дасягненняў духоўнай і матэрыяльнай цывілізацыі Еўропы і Міжземнамор’я, што дасёння перадвызначаюць яе як вонкава, гэтак і сутнасна. Урэшце, менавіта ў Еўропе былі сфармуляваныя тыя прынцыпы аховы спадчыны, якія выкарыстоўваюць у цэлым свеце. Дарэчы, і сістэма ўнівэрсітэцкай адукацыі – таксама еўрапейскі здабытак.

«Еўрапейскасць» культурнай спадчыны можна вызначаць рознымі спосабамі. Сам панятак «спадчына», інстытуты аховы і рэстаўрацыі, як мы іх ведаем, народжаныя менавіта на еўрапейскім кантыненце. Такое адказнае стаўленне да мінулага, пастаяннае вызначэнне сябе праз прыналежнасць да традыцыі, да гістарычнага асяроддзя – выключна еўрапейская «фішка». Ва ўсіх іншых частках свету праца са спадчынай тым больш развітая, чым інтэнсіўней туды прыходзілі Заходнія ідэі культуры.

Яшчэ нам падабаецца думаць пра еўрапейскую спадчыну як пра сукупнасць лепшых падыходаў да яе захавання, інтэрпрэтацыі і аднаўлення. Лепшыя яны тым, што ў іх закладваецца пэўны набор каштоўнасных установак: адказнае стаўленне да культуры, прыняцце складанасці гістарычнага шляху і неабходнасці пераадолення канфліктаў. І вось так, актуалізуючы новую або забытую спадчыну, мы на самай справе думаем пра развіццё нашых гарадоў, вучымся выкарыстоўваць сацыяльны і эканамічны патэнцыял спадчыны.

У 2006 годзе спачатку як міжурадавая ініцыятыва, а з 2013 года ужо як афіцыйнае мерапрыемства Еўрапейскага Саюза распачалася праграма «Знак Еўрапейскай Спадчыны» (European Heritage Label), накіраваны на тое, каб адзначыць аб’екты спадчыны, якія з’яўляюцца вехамі ў стварэнні сучаснай Еўропы. Ад часоў зараджэння цывілізацыі да Еўропы, якую мы бачым сёння, гэтыя аб’екты і мясціны вызначаюць і сімвалізуюць еўрапейскія ідэалы, каштоўнасці, гісторыю і інтэграцыю. На сённяшні дзень у спісе 48 мясцін і аб’ектаў з 24 краін. Агульная колькасць расце, але беларускіх аб’ектаў сярод іх пакуль няма.

Думаецца, што гэтая адсутнасць – не столькі праблема, колькі запрашэнне паразважаць пра патэнцыял культурнай спадчыны Беларусі ў кантэксце яе значнасці для Еўропы. У такім ракурсе інтэрпрэтацыя аб’ектаў спадчыны можа значна павысіць іх вартасць і інспіраваць большую рэгіянальную ды міжнародную цікавасць. Пры комплексным падыходзе яны могуць мець большую каштоўнасць, чым уяўляецца сёння.

Мы склалі свой вельмі суб’ектыўны спіс беларускіх мясцін, якія маглі б першачаргова прэтэндаваць на статус Еўрапейскай спадчыны. Запрашаем да дыскусіі!

## Археалагічная спадчына ў ваколіцах Мінска

Калі мы глядзім на матэрыяльную і духоўную спадчыну Беларусі шырэй, чым на уласна нацыянальны наратыў ды спрабуем зазірнуць па-над межамі і эпохамі, то адкрываюцца новыя далягляды і кантэксты.

Сярод іншага, такой унікальнай лакацыяй на ўскрайку сталіцы Беларусі ёсць Банцараўшчына – старажытнае селішча і гарадзішча балтаў ранняга жалезнага веку. Яно захавалася ў амаль некранутым выглядзе. Гэтае абнесенае двума валамі селішча існавала тут ужо ад III стагоддзя да нашай эры. Спакваля яно ўмацоўвалася, пераўтвараючыся ў культавы цэнтр, ды праіснавала больш як тысячу гадоў! Назва ўрочышча, дзе калісь квітнеў гэты цэнтр, дала назву і адной з найбуйнейшых у гісторыі Ўсходняй Еўропы археалагічнай культуры – Банцараўскай, якая ахоплівала вялізарныя абшары не толькі ў самым цэнтры Беларусі, але і на сумежных тэрыторыях Літвы, Латвіі і Расеі, паміж вытокамі Дзвіны, Нёмана і Дняпра. Яе носьбіты належылі да найбольш ранніх каланізацыйных балта-славянскіх плыняў на ўсходзе Еўропы і сталі папярэднікамі астатніх культураў рэгіёна.

Рэгенерацыя ландшафту тэрыторыі Банцараўшчыны і стварэнне там адмысловых экспазыцый, тэматычнага парку і віртуальных рэсурсаў магло б стаць адным з самых значных і цікавых праектаў усяго рэгіёна балта-славянскага памежжа.

Полацк, Спаса-Праабражэнскі сабор
Наведванне места працы рэстаўратараў манументальнага жывапісу «пакуль лясы не знялі»
Фота Ігара Раханскага



## Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр з саборам XII стагоддзя у Полацку

Не сакрэт, што да сярэдзіны XIII стагоддзя Полацк, размешчаны на шляху «З вараг у грэкі», быў яшчэ і галоўным гандлёвым партнёрам Ганзейскага саюза. Будаўніцтва ў ім багатага манастыра сведчыла не толькі аб адкрытасці беларускіх зямель, але і пра імклівы рост хрысціянства тут.

Мастацкае рашэнне Спаса-Праабражэнскага сабора XII стагоддзя сумяшчае грэцкую, візантыйскую і старажытнарускую традыцыі. Яго амаль тысячагадовая гісторыя адлюстроўвае суперніцтва двух лідзіруючых хрысціянскіх традыцый – праваслаўя і каталіцтва, якое завяршылася іх мірным суіснаваннем на сучасным этапе.

Усё гэта дазволіла ўключыць манастыр у Папярэдні спіс Сусветнай спадчыны.

У 2019 годзе Міністэрства культуры Беларусі пад эгідай Дзён Еўрапейскай спадчыны правяло ў манастыры канферэнцыю, якая аб'яднала рэстаўратараў некалькіх краін. Дарэчы, у саборы ўжо праведзена ўнікальная рэстаўрацыя, якая дазволіла не толькі раскрыць комплекс самых старажытных фрэсак, але і захаваць ды праэкспанаваць усе пазнейшыя роспісы. Цяпер навукоўцы думаюць, як засцерагчы раскрытыя фрэскі XII стагоддзя ад тэмпературна-вільготнаснага ўздзеяння. Ацэньваючы якасць ужо праведзеных работ і ўзровень прыцягнутых спецыялістаў, мы ўпэўненыя, што будзе знойдзена самае лепшае рашэнне.

Паўночная башня Крэўскага замка
пасля кансервацыі у 2020 годзе
Фота Віктара Палсцюка



# Старажытнае мястэчка Крэва

Пра гісторыю Крэўскага замка напісана багата. Перадусім ён увайшоў у сусветную гісторыю фактам падпісання тут Крэўскай вуніі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам, у выніку чаго паўстала найвялікшая ад часоў Рымскай імперыі дзяржава ў Еўропе.

Але само Крэва – гэта не толькі руіны замка, што ўжо маюць уласную вялікую гісторыю вывучэння ды рэстаўрацыі. У гэтым мястэчку, што згадваецца ў нямецкіх хроніках XIII стагоддзя, захоўваецца магутнае гарадзішча, што да пабудовы замку і было цэнтрам ранняга Крэва. Тут праходзіла мяжа паміж старажытнай Літвой ды Полацкай зямлёй. Таму з гледзішча сацыяльнай, этнічнай, культурнай гісторыі гэты археалагічны аб’ект надзвычай важны. Тут быў цэнтр з развітай вытворчасцю і шырокімі замежнымі сувязямі.

Недзе тут, на гарадзішчы, знаходзіўся і першы з ліку сямі каталіцкіх храмаў, паўсталых пасля хросту паганскай Літвы Ягайлам. Гэты факт стаў паваротным пунктам у гісторыі не толькі Беларусі і Літвы, але і наогул для лёсу хрысціянства на разлогах Усходняй Еўропы.

Само Крэва дасёння захавала стражытную планіровачную структуру і сведчанне колісь поліэтнічнага, поліканфесійнага грамадства – будынкі сінагогі і міквы, праваслаўная царква, касцёл, праваслаўныя, каталіцкія, юдэйскія і мусульмансія могілкі. Разам з помнікамі прыроды і культурным ландшафтам, усё Крэва – унікальны комплексны аб’ект спадчыны, ілюстрацыя да гісторыі гэтай часткі Еўропы ад ранніх стагоддзяў да Першай сусветнай вайны, калі мястэчка было на лініі фронту з 1915 да 1918 года. Дарэчы, ад той вайны тут захаваліся нямецкія бліндажы, рэшткі вузкакалейкі, акопы, варонкі ад снарадаў і вайсковыя пахаванні…

Рэстаўрацыя інтэр'ера капліцы Нясвіжскага Замка.
Творчая майстэрня «Басталія»
Фота Ігара Раханскага



# Легендарны Нясвіж

Унікальнасць Нясвіжа не ў паасобных помніках розных эпох, а ў ансамблі будынкаў канца XVI стагоддзя і іх узаемасувязях. Менавіта як помнік горадабудаўніцтва з элементамі культурнага ландшафту і архітэктурнымі пярлінамі той эпохі гэты горад мае выключную каштоўнасць у агульнаеўрапейскім кантэксце. Гэта прыклад наўпростага натхнення Італіяй, стылем барока для цэлага рэгіёна. Сёння гэты рэгіянальны барочны стыль з'яўляецца адной з найбольш каштоўных частак супольнай спадчыны Беларусі, Польшчы, Літвы ды Ўкраіны.

Помнікі эпохі ранняга барока з'яўляюцца таксама красамоўным сведчаннем агульнаеўрапейскага шляху развіцця нашай цывілізацыі. Італьянскі дойлід Бернардоні з памочнікамі прыбыў у Польшчу, а затым і ў Беларусь, дзе, у Нясвіжы, пражыў трынадцаць гадоў. Адначасна з ім у Рэчы Паспалітай працавалі таксама італьянскія дойліды-езуіты. Для рэалізацыі новага тыпу планаў і будаўнічых канструкцый Бернардоні павінен быў цягам гадоў кіраваць будаўніцтвам і навучаць новым тэхналогіям тутэйшых майстроў. Такім чынам, ягоны уплыў відавочна большы, чым толькі аўтарства паасобных праектаў. Ягоны вучань Ян Франкевіч з Мінска стаў аўтарам праектаў першых барочных храмаў Вільні.

Таму вывучэнне і аднаўленне аб'ектаў Нясвіжа часоў Бернардоні разам з замкам, Фарным касцёлам і Ратушай далі б больш поўнае ўяўленне не толькі пра архітэктурную стылістыку эпохі, яе светапозірк, але і пра памкненне стварыць ідэальны горад.



Адрэстаўраваны роспіс XVIII стагоддзя ў Саборы святых апосталаў Пятра і Паўла у Мінску. Творчая майстэрня «Басталія» Фота Фёдара Сарокі

## Сабор святых апосталаў Пятра і Паўла ў Мінску





Праваслаўны храм, збудаваны ў канцы 1620-х гадоў. Адзін з самых старых будынкаў Мінска. Сабор згубіўся ў сучаснай мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай забудове вуліцы Нямігі і, непрыкметны, звонку не выклікае асаблівых эмоцый. Думаем, што нават не ўсе мінчане там былі. Яго сакрэт унутры, і гэта – неверагодная рэстаўрацыя інтэр'ера. У 2017 годзе праца па рэстаўрацыі насценных роспісаў была адзначана дыпломам вядучай еўрапейскай арганізацыі ў галіне захавання культурнай спадчыны Europa Nostra. Гэта значыць, ёй можна ганарыцца і паказваць прафесійнаму рэстаўратару з любой краіны як эталон.

Справа ў тым, што за ўсю гісторыю на сцены храма былі нанесеныя тры пласты роспісаў. Шчыра кажучы, ні адзін не быў сусветным шэдэўрам. Але кожны з'яўляецца неаспрэчнай гістарычнай каштоўнасцю. Дык вось, рэстаўратары з творчага аб'яднання «Басталія» здолелі прыдумаць, як раскрыць і на месцы праэкспанаваць кожны з пластоў адначасова. Менавіта гэтая філігранная праца паставіла наш сціплы храм на сусветны ўзровень. Нам даводзілася чуць, як аб праведзенай рабоце распавядае яе кіраўнік – мастак-рэстаўратар Фёдар Сарока. Пад час яго экскурсіі з'явілася пачуццё нерэальнасці. Падумалася, вось так напэўна Джотта мог распавядаць пра роспіс сваёй капэлы Скравені.

Крэпасць у Бабруйску
Фота Харальда Бібеля

# Бабруйская крэпасць

Тэрыторыя Бабруйскай крэпасці – месца старажытнага горада і замка, што існаваў тут ад XIV стагоддзя. Гэта тэрыторыя захоўвае ў сабе велізарны патэнцыял для вывучэння і рэгенерацыі. Тут быў магдэбургскі горад, наўпрост знітаваны з гісторыяй вялікага рэгіёна. Ягоны тагачасны выгляд мы ведаем паводле гравюры галандскага мастака Абрахама ван Вестэрфельда. Цэнтрам Бабруйска быў фарны касцёл Пятра і Паўла, дзе знаходзіўся цудатворны абраз Панны Марыі. Яго пробашчам з'яўляўся Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч – будучы мітрапаліт усёй каталіцкай царквы на абшарах Расійскай імперыі і арцыбіскуп Магілёўскі. Менавіта тут быў хрышчоны Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – пачынальнік новай беларускай літаратуры і драматургіі.

Адным са стваральнікаў ансамбля фартэцыі стаў выбітны навуковец, гісторык, археолаг і архівіст Тэадор Нарбут, якога лічаць пачынальнікам літоўскай гістарыяграфіі, а таксама першым прафесійным даследчыкам балцкай міфалогіі.

Крэпасць, апрача відавочнай каштоўнасці ў якасці помніка фартыфікацыі XIX стагоддзя, таксама знітавана са шматлікімі падзеямі ваеннай гісторыі, ад кампаніі Напалеона 1812 года да падзеяў 1917, калі тут месціўся цэнтр Першага Чэхаславацкага запаснога палка, куды наведаўся Томаш Масарык, будучы першы прэзідэнт Чэхаславакіі, і нарэшце падзеяў 1918–1920 гадоў, калі крэпасць была спачатку цэнтрам Першага польскага корпуса, а затым месцам важнейшых баёў савецка-польскай вайны. Тэрыторыя крэпасці была і месцам трагічных падзей Другой сусветнай вайны...

З 1836 года тут дзейнічала метэаралагічная станцыя, а на пачатку XX стагоддзя месцілася адна з самых магутных у Еўропе радыё-тэлеграфічных станцый, дзе можна было атрымліваць сігналы з Парыжа ды Масквы. То бок былая крэпасць у Бабруйску – важная частка рэгіянальнай і еўрапейскай спадчыны!





Цытадэль – абарончая казарма, руіны Белага палаца, Інжынернага ўпраўленьня, Арсеналу, казармы памежнікаў, падмурак сталовай каманднага складу
Фота Wikimedia Commons

# Стражытны Брэст і Брэсцкая крэпасць

Брэсцкая крэпасць – агульнавядомы брэнд Беларусі. Але таксама на тэрыторыі крэпасці некалі быў адзін з найстаражытнейшых і славутых гарадоў рэгіёну, першы, які ў 1390 годзе атрымаў Магдэбургскае права! Менавіта на гэтай тэрыторыі знаходзіцца ў недаследаваных археалагічных пластах мураваны Мікалаеўскі сабор XIV стагоддзя, дзе была падпісна Брэсцкая царкоўная унія. Раскопкі сабора ніколі не праводзіліся.  Там жа – першая на абшарах нашага рэгіёну мураваная сінагога XV стагоддзя, якая стала ўзорам для ўсіх іншых сінагог, а потым у 1812 годзе была перабудавана пад патрэбы крэпасці. Тамсама месціліся адзін з першых каталіцкіх храмаў ВКЛ – Касцёл Святога Крыжа і Святой Ганны (фара Вітаўта) ды першы кляштар аўгустынцаў; друкарня, першая на тэрыторыі Беларусі, дзе была выдадзена славутая брэсцкая Біблія, манетны двор. Тут шматкроць праводзіліся сеймы Вялікага Княства Літоўскага. Тут жылі дзесяткі славутых дзеячоў культуры і рэлігіі, чыя духоўная спадчына належыць многім народам. Тут адбываліся важныя падзеі, знітаваныя з гісторыяй усёй Усходняй Еўропы.

Дасёння тут застаюцца ў стане руін такія выдатныя помнікі архітэктуры, як кляштары бернардынцаў, іезуітаў, трынітарыяў, базыльянаў ды іншыя...

У перыяд будаўніцтва ў 1836–1842 гадах крэпасць можна аднесці да аднаго з самых дасканалых умацаванняў Еўропы. Яе гісторыя звязана з сумнымі падзеямі Другой сусветнай. Аднак мала хто ўсведамляе, што грандыёзны мемарыял «Брэсцкая крэпасць-герой» займае толькі 30% тэрыторыі крэпасці, а 70% амаль не выкарыстоўваецца. Але чаму? І як варта было б развіваць гэтую тэрыторыю з выкарыстаннем яе шырокага патэнцыялу?

Мясцовыя ўлады думаюць пра гэта, але і грамадскасць не застаецца ў баку. У горадзе дзейнічае выдатная арганізацыя Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці, якая не толькі вывучае і папулярызуе спадчыну крэпасці, але і распрацавала канцэпцыю стварэння міжнароднага гісторыка-культурнага цэнтра, здольнага прыцягнуць да 2 мільёнаў наведвальнікаў штогод. А патэнцыял там вялізны: розныя пласты гісторыі, да таго ж асобныя крэпасныя ўмацаванні размешчаны на тэрыторыі Польшчы, што робіць крэпасць выдатным месцам для рэалізацыі транспамежных еўрапейскіх праектаў. Дарэчы, у большасці краін Еўрасаюза 9 мая – гэта менавіта «Дзень Еўропы», які адзначаецца як дзень адзінства. Пагадзіцеся, Брэсцкая крэпасць – лепшае месца, каб падумаць пра важнасць міра.

Будынак Слонімскай
харальнай сінагогі
Фота Грыгорыя Хейфеца

# Сінагогі Беларусі

Вы напэўна ніколі не думалі пра іх з гэтага боку, аднак суседства хрысціянскіх і іудзейскіх храмаў – тыповая прыкмета еўрапейскіх гарадоў. На ўсход ад рысы аселасці такога не сустрэнеш. У рэгіёне ж былой Рэчы Паспалітай – амаль у кожным горадзе. Але ёсць праблема. У адсутнасць іудзейскіх абшчын велізарная колькасць былых сінагог руйнуецца. Яны папросту закінутыя. І гэта будынкі ў самых цэнтрах нашых гарадоў! А між тым, сярод іх ёсць сапраўдныя пярліны: Слонім, Ашмяны, Ружаны, Быхаў. Ці вось яшчэ – у Віцебску месцяцца руіны Вялікай Любавіцкай сінагогі, якую, верагодна, наведваў Марк Шагал. Усе гэтыя каштоўныя будынкі сёння на мяжы знікнення.

У 2018 годзе брытанская арганізацыя «Габрэйская спадчына Еўропы» вылучыла 19 еўрапейскіх сінагог, страта якіх будзе найбольш балючай. Першае месца заняла Слонімская сінагога. Недалёка ад яе ў спісе – Ашмянская. Абодвума аб’ектамі цяпер займаюцца, але рэстаўрацыі іх яшчэ не пачаліся. Беларускі камітэт ІКАМОС разам з ЕГУ дапамагае мясцовым ініцыятывам. Галоўнае – зрабіць сінагогі патрэбнымі жыхарам, актуалізаваць іх, ўпісаць у мясцовае жыццё. Тады яны зноў «зажывуць», бо само слова «сінагога» азначае не храм, а перадусім супольнасць, грамаду.





Мсціслаў, Кармяліцкі касцёл
Унебаўзяцця Панны Марыі
Фота Wikimedia Commons

## Гістарычны Мсціслаў

Гэты невялікі горад на самым усходзе Беларусі часам называюць «горадам на мяжы Еўропы». Магілёўская вобласць не вельмі асацыюецца з гістарычнымі гарадамі, аднак захаванасць спадчыны Мсціслава здольная здзівіць: два сярэднявечных гарадзішча, два касцёлы, дзве царквы, старая цагляная і выдатная драўляная забудова на шматлікіх пагорках і далінах ствараюць адчуванне гармоніі. Храналагічны абшар разнастайных мсціслаўскіх аб'ектаў ахоплівае перыяд з XII па XIX стагоддзе. Таксама ў горадзе месціцца музей, у якім можна пабачыць унікальную берасцяную грамату пачатку XII стагоддзя. І ўсё ж мы ўключылі Мсціслаў у дадзены спіс не за ягоную прыгажосць, а за тое, што менавіта гэты горад быў абраны для ўдзелу ў праграме Савета Еўропы COMUS, прысвечанай распрацоўцы стратэгій развіцця гістарычных гарадоў, арыентаваных на інтарэсы мясцовых супольнасцяў. Гэта была спроба разам з жыхарамі вызначыць, якім быць гораду. І гэта вельмі добрая практыка, якую трэба было б распаўсюдзіць на іншыя гістарычныя гарады Беларусі, безадносна ўдзелу Еўрасаюза.